# АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ КАНЧАТКА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

*Пархач Ксенія Мікалаеўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Методыка работы над кожнай з марфем мае свае асаблівасці, паколькі іх лінгвістычная сутнасць спецыфічная. Своеасаблівым, у параўнанні з прыстаўкай і суфіксам, з’яўляецца канчатак, для якога вядучай з’яўляецца граматычная функцыя.

Фарміраванне і развіццё ў вучняў пачатковых класаў навыкаў марфемнага аналізу слоў мэтазгодна пачынаць з выпрацоўкі ўменне выдзяляць слова з кантэксту і ўсведамлення яго ў адзінстве ўнутранага і знешняга бакоў, гэта значыць у адзінстве лексічнага і граматычнага значэнняў.

Паколькі носьбітам канкрэтнага лексічнага значэння любога самастойнага слова з’яўляецца аснова, а паказчыкам граматычнага значэння – канчатак, то, па меркаванні Л. Падгайскага, вывучэнне марфемнай будовы слова мэтазгодна пачынаць са знаёмства з дзвюма сэнсавымі часткамі: канчаткам і асновай (прапедэўтычны этап).

Практыка паказвае, што ўменне знаходзіць у слове канчатак – справа для вучняў пачатковых класаў зусім не простая.

Цяжкасці ў вызначэнні канчатка выклікаюць шматлікімі прычынамі: па-першае, канчатак «найбольш бесцялесная частка слова» (Р.В. Вінакур), у адрозненні ад прыставак і суфіксаў, значэнне якіх вучнямі адчуваецца дастаткова выразна; па-другое, «... каб правільна правесці мяжу паміж асновай і канчаткам, трэба добра ведаць гукавое значэнне літар, не забываць, што асобныя літары нашага алфавіта абазначаюць то адзін, то два гукі» (М.М. Шанскі); па-трэцяе, «у асобных (праўда, не вельмі шматлікіх) выпадках для таго, каб правільна вызначыць канчатак, недастаткова параўнаць даную форму з іншымі формамі таго ж слова. Прыходзіцца прыбягаць да параўнання з адпаведнымі формамі іншых (у той ці іншай ступені аднатыповых) слоў» (М.М. Шанскі).

У сістэму практыкаванняў, што прапануюцца вучням, уваходзяць заданні, якія павінны падвесці малодшых школьнікаў да вываду: слова можа змяняцца. Змест такіх практыкаванняў зводзіцца да ўменняў: а) змяняць слова па тыпе «адзін-многа», «многа-адзін»; б) выбраць з дзвюх прапанаваных формаў патрэбную ў канкрэтным выпадку; в) знайсці адно і тое ж слова (назоўнік), ужытае ў прапанаваным тэксце ў пачатковай форме; д) выкарыстаць слова ў пэўнай граматычнай форме ў адпаведнасці з патрабаваннем сэнсу сказа.

Сістэматычная ўвага да формы слова дазваляе ўжо на падрыхтоўчым этапе, які папярэднічае вывучэнню марфемнага складу слова, дасягнуць свядомага разумення канчатка як зменнай часткі слова. Гэтаму садзейнічаюць

заданні, якія даюць магчымасць назіраць за змяненнем канчатка ў залежнасці ад змянення ліку назоўніка і ад яго сувязі з іншымі словамі ў сказе.

Больш глыбокае разуменне ролі канчатка дасягаецца ў працэсе вывучэння тэмы «Сувязь слоў у сказе». Тут ёсць магчымасць паказаць змяненне слова ў залежнасці ад яго сэнсавай і граматычнай сувязі з іншымі словамі, звярнуць увагу на сінтаксічную ролю канчатка (формы слоў, сувязь слоў).

Другі этап у сістэме работы па засваенні канчатка звязаны непасрэдна з вывучэннем раздзела «Склад слова», дзе паказваецца паказваецца змяненне аднаго і таго ж слова ў залежнасці ад яго сувязі з іншымі словамі.

Першапачатковае ўяўленне аб канчатку як зменнай частцы слова, з дапамогай якой устанаўліваецца сувязь слоў у сказе, складваецца ў вучняў пры выкананні практыкаванняў, якія ўключаюць заданні, накіраваныя на змяненне формы слова ў залежнасці ад спалучэння яго з іншымі словамі ў сказе. Напрыклад, патрабуецца ў адпаведнасці з сэнсам сказа змяніць слова так, каб яно аказалася звязаным з іншымі словамі: *Лета наша сям'я правяла на (бераг) Белага возера.* Пад кіраўніцтвам настаўніка малодшыя школьнікі шукаюць адказ на пытанні: «Чаму прыйшлося змяніць канчатак у слове? Што дзякуючы гэтаму дасягаецца?»

Вывучэнне канчатка будуецца выключна на матэрыяле сказаў і словазлучэнняў, гэта значыць на сінтаксічнай аснове. Па традыцыі спачатку высвятляецца прымета зменнасці канчатка (расце *бяроза*, распусціліся на *бярозе*, галінкі *бярозы*, любуюся *бярозай*). Для раскрыцця сінтаксічнай функцыі канчатка самым найлепшым матэрыялам з'яўляецца ланцужок слоў у пачатковай форме ( так званы дэфармаваны сказ), якія трэба звязаць, як у жывой мове, напрыклад: *Мы любіць свой школа.* Аналіз такога «сказа» можна абмежаваць пытаннямі: Ці гаворым мы так, як напісана? 2. Як змяніць словы, каб было зразумела? Часткі *-ім, -аю, -у* ў зменных словах служаць для іх сувязі. Гэта і ёсць канчаткі. Пэўны канчатак існуе толькі на фоне іншых канчаткаў таго ж слова. Паколькі вучні пачатковых класаў яшчэ не знаёмы са словазмяненнем часцін мовы, то выдзеліць у аснове канчатак ім не так проста; куды лягчэй ужыць у гатовым тэксце словы з патрэбным канчаткам.

Вывучэнне тэмы «Канчатак» прадугледжвае знаёмства ималодшых школьнікаў з асаблівасцямі змянення слова, калі яно ўжываецца ў розных сваіх формах у словазлучэнні ці сказе.

Але ў вывучэнні гэтай тэмы важныя не толькі звесткі аб розных канчатках слоў розных часцін мовы, але і яго сэнсавае значэнне, яго выкарыстанне ў кантэксце. Настаўніку важна падкрэсліць, што яно існуе не само па сабе, а ў сувязі з іншымі словамі.

*Брат, сястра, даганяць, а, сястра, брат, уцякаць (дзень і ноч).*

Пры аналізе бачым, што большасць слоў змянілася для таго, каб уступіць у сувязь з іншымі словамі, гэтаму дапамаглі канчаткі. З набору слоў, якія нічога не выражалі, узнік сказ, які нясе пэўную інфармацыю.

Усведамленне вучнямі сінтаксічнай функцыі канчатка адбываецца на аснове засваення сувязі слоў у сказе і словазлучэнні. І хаця веды малодшых школьнікаў аб сувязі слоў носяць элементарны характар, яны падводзяцца да разумення таго, што сэнсавая і граматычная залежнасць слоў у словазлучэнні выражаецца канчаткам ( у прыназоўнікавых словазлучэннях гэтай мэце служаць яшчэ і прыназоўнікі). Аб усведамленні вучнямі сінтаксічнай ролі канчатка можна меркаваць па ўменні выдзеліць са сказа словы, звязаныя па сэнсе і граматычна, і па ўменні тлумачыць, з дапамогай чаго ўстанаўліваецца сувязь: з дапамогай канчатка або канчатка і прыназоўніка. Указаны ўзровень тлумачэння становіцца даступным большасці вучняў пачатковых класаў пасля таго, як яны вывучаць скланенне назоўнікаў і прыметнікаў.

Пасля вывучэння канчатка і яго ролі мэтазгодна даваць словы ў пачатковай форме, каб вучні самі змянялі іх у адпаведнасці з сэнсам сказа.

Трэці этап у засваенні канчатка як паказчыка граматычнага значэння слова накіраваны на вывучэнне граматычных катэгорый роду і ліку назоўнікаў і прыметнікаў, ліку і часу дзеясловаў. На гэтым этапе надаецца значная ўвага азнаямленню вучняў са склонавымі формамі назоўнікаў усіх трох родаў (адзіночны і множны лік) і фарміраванню навыку правільнага напісання канчаткаў назоўнікаў у пачатковай форме, а таксама прыметнікаў у формах мужчынскага, жаночага і ніякага роду (адзіночны лік) і ў форме множнага ліку (назоўны склон).

Азнаямленне са змяненнем назоўнікаў у сувязі з іншымі словамі ў сказе праводзіцца на аснове частковага сінтаксічнага разбору, а менавіта шляхам пастаноўкі пытанняў ад дзеяслова-выказніка да залежнага ад яго даданага члена сказа-назоўніка ў форме ўскоснага склону: *дапамагаю (каму?) бабул-і, хаджу з кім?) з сястр-ой, люблю (каго?) мам-у* і г.д.

Чацвёрты этап звязаны з усведамленнем канчатка як паказчыка склонавай формы і выпрацоўкай на гэтай аснове яго правільнага напісання, што залежыць ад комплекснага выкарыстання ведаў з фанетыкі і граматыкі (пры ўліку ў асобных выпадках і лексічнага значэння слова).

Вывучаючы тэму «Канчатак і аснова слова», вучні пачатковых класаў павінны засвоіць наступныя палажэнні аб канчатку: у словах могуць быць «матэрыяльна выражаныя» (тэрмін М.М. Шанскага), гукавыя канчаткі: *бел-ы, бяроз-а, чыта-еш*; нулявыя канчаткі: *дом, вучыў, печ*; ёсць словы і без канчатка: *таксі, там, заўтра*.

Для замацавання ролі канчатка і выпрацоўкі ўмення яго знаходжання можна прапанаваць наступныя практыкаванні:

1. Выпішыце ў адзін слупок формы аднаго і таго ж слова, у другі – розныя словы з адным тым жа коранем, растлумачце лексічнае значэнне аднакарэнных слоў:

а) рака, зарэчны, ракі, прырэчны, рачны, на рацэ, раку, надрэчны, рэчышча;

б) каса, касіць, касы, кассё, выкасіць, накасіць, касе, касец, косаў, касілка, косы, касьба.

2. Складзіце словазлучэнні. Назавіце словы з прамым і пераносным значэннем; у прыметніках абазначце канчаткі: *цёплы* (вецер, вада, позірк), *гарачы* (кава, спрэчка, пясок, час), *мяккі* (характар, клімат,валасы), *халодны* (дзень, сустрэча, чай), *востры* (нож, слова, сітуацыя, пытанне), *свежы* (хлеб, навіна, снег, газета), *салодкі* ( сон, мара, мёд, цукеркі).

3. Выдзеліце ў слове канчатак і акрэсліце яго значэнне.

4. Са слоў, дадзеных у пачатковай форме, складзіце сказы.

5. Складзіце тэкст, выкарыстоўваючы ў якасці сродку сувязі формы аднаго і таго ж слова.

Назапашванне ведаў вучняў аб канчатку адбываецца ў далейшым пры вывучэнні марфалогіі: канкрэтызуюцца ўяўленні аб сувязі паміж словамі, асэнсоўваюцца граматычныя ўласцівасці слоў пэўных часцін мовы, і таму інфармацыя, якую нясуць канчаткі, становіцца для вучняў больш змястоўнай і зразумелай.